2. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Спр. 3261.
3. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Спр. 6172.
4. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 25. – Спр. 33.
5. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1444.
6. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1475–1476.
7. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1477.
8. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1478.
9. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1479.
10. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1480.
11. НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 28. – Спр. 7.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск: Губернская типография, 1914. – 406 с.; Памятная книжка Могилевской губернии на 1914 год. – Могилев: Губернская типография, 1914. – 588 с.
13. Управление духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. – Кн.1. О управлении духовных дел христиан римско-католического и армяно-католического исповеданий // Свод законов Российской империи / Сост. Н.П. Балканов, С.С. Войт, В.Э. Герценберг / Под ред. И.Д. Мордухай-Болтовского. – Санкт-Петербург: Русское книжное товарищество «Деятель», 1896. – Т. XI. – С. 1172–1202.
14. Directorium officii divini et missarum Generale pro utroque clero archdioecesis Mohilevensis in Annun Domini MDCCCXXI auctoritate et mandato illustrissimi, excellentissimi AC reverendissimi Domini Domini Stanislai Siestrzencewicz a Bohusz. – Mohilevie: Typis palatii metropolitani Rom. Catholic., 1820. – 73 k.; 1824 – 75 k.; 1825 – 75 k.; 1828 – 75 k.; 1830 – 75 k.; 1831 – 75 k.; 1832 – 80 k.; Directorium officii divini ac missarum ad ussum utriuque Cleri Archi-Dioecesis Mohileviensis pro anno Dni MDCCCXXXIII. – Mohilevie: typis consistorii Rom Catholic, 1832. – 75 k.; 1833 – 75 k.; 1834 – 75 k.; 1837 – 75 k.; 1838 – 76 k.; 1840 – 61 k.; 1841 – 70 k.; 1842 – 70 k.; 1843 – 63 k. і інш.
15. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). – F. 694. – Ap. 1. – B. 3634. – Статыстычныя ведамасці па Магілёўскай архідыяцэзіі, 1823 г.

**Мяньчэня С.В.**

# ДАКУМЕНТЫ ГУБЕРНСКІХ КАМІТЭТАЎ ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ НГАБ)

Пытанні дзяржаўнай палітыкі расійскіх уладаў па рэалізацыі дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць і продаж алкагольных напояў (1894–1917 гг.) і асаблівасці яе рэалізацыі на Беларусі з’яўляюцца мала даследванымі ў айчыннай гістарычнай навуцы. Між тым вывучэнне гістарычнага вопыта па абмежаванню спажывання алкаголя мае не толькі навуковае, але і важнае практычнае значэнне.

Практычная рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі Расійскай Імперыі ў дадзенай галіне была ўскладзена на мясцовыя камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці, што дзейнічалі пад кантролем Галоўнага ўпраўлення неакладных збораў і казённага продажу піцей Міністэрства фінансаў. Губернскія камітэты пад кіраўніцтвам губернатара, а павятовыя на чале з мясцовым прадвадзіцелем дваранства займаліся пытаннямі арганізацыі чайных, бібліятэк-чытальняў і “народных дамоў” (комплекс, дзе знаходзіліся чайная, сталовая, бібліятэка-чытальня, крама па продажу канцэлярскіх прадметаў, зала для народных чытанняў і канцэртаў, гасцініца), правядзеннем народных чытанняў на антыалкагольную тэматыку і іншыя тэмы, сачылі за выкананнем правіл дзяржаўнай “віннай” манаполіі, ажыццяўлялі арганізацыю культурнага дасуга насельніцтва, садзейнічалі адкрыццю і ўтрыманню лячэбных установ для хворых на алкагалізм і пакутваючых ад запояў [8, арк. 3].

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца дакументы Віцебскага, Мінскага і Магілёўскага губернскіх камітэтаў. Дакументы Віцебскага губернскага камітэта папячычельства аб народнай цвярозасці і яго павятовых аддзяленняў аб’яднаны ў 3 асноўныя фонды: ф. 2709 – дакументы ўласна губернскага камітэта (97 спраў), ф. 2555 – дакументы Віцебскага павятовага камітэта (247 спраў), ф.

3283 – дакументы Гарадокскага павятовага камітэта (1 справа). Дакументы ахопліваюць час з утварэння камітэтаў (1897 г.) да 1913 г. Большая частка дакументаў дачытыцца перыяду найбольшай актыўнасці камітэтаў 1897–1903 гг. Фонд Гарадокскага павятовага камітэта ўяўляе сабой усяго адзін дакумент за 1903 г. Дакументы Мінскага губернскага камітэта: ф. 57 – губернскі камітэт (22 справы), ф. 132 – Мінскі павятовы камітэт (65 спраў), ф. 1412 – Рэчыцкі павятовы камітэт (1 справа), ф. 1098 – Ігуменскі павятовы камітэт (1 справа). Часовыя рамкі – 1897–1917 гг. Дакументы Магілёўскага губернскага камітэта: ф. 2296 – Магілёўскі павятовы камітэт (11 спраў). Часовыя рамкі – 1897–1912 гг.

Як бачна, большая частка дакументаў датычыцца Віцебскай губерніі, і таму дзейнасць Віцебскага губернскага і павятовага камітэтаў прадстаўлена больш поўна. На разглядзе гэтых матэрыялаў спынімся больш падрабязна. Сярод архіўных дакументаў можна выдзяліць наступныя групы: справаздачы камітэтаў, журналы паседжанняў, перапіска з дзяржаўнымі ўстановамі і прыватнымі асобамі, бухгалтерскія кнігі.

Штогадовыя справаздачы віцебскага павятовага і губенскага камітэта, прызначаныя для Міністэрства фінансаў, ахопліваюць амаль час да 1913 г., калі іх дзейнасць паступова не прыпынілася, а у гады Першай сусветнай вайны страціла сваю актуальнасць у сувязі з заканадаўчымі абмежаваннямі продажу і ўжывання алкаголю. Штогадовыя справаздачы іншых губернскіх камітэтаў у архіве адсутнічаюць.

Справаздачы камітэтаў складаюцца з некалькіх раздзелаў: інфармацыя аб складзе камітэта, колькасць членаў, іх сацыяльны склад і ўзровень актыўнасці; асноўныя накірункі дзейнасці (дадзеныя па чайным і сталовым, бібліятэкам, народным спектаклям, чытанням і гулянням), фінансавыя рахункі, спіс маёмасці і т.д. Асобна вызначаліся адносіны мясцовага насельніцтва да мерапрыпрыемстваў камітэта, аналізаваліся прычыны няўдалых мерапрыемстваў [11, арк. 2–5]. Падобным чынам складаліся і справаздачы мясцовых устаноў – чайных, “народных дамоў”, бібліятэк.

У справаздачах загадчыкаў чайных указваліся цэны на прадукты, смета прыбытку і расходаў (арэндная плата, заробак персанала, прытак ад продажу габраты, цукра, папірос і закусак), колькасць наведвальнікаў па месяцах, асобна мужчын і жанчын, культурна-асветніцкія мерапрыемствы. Асобую цікавасць выклікаюць прыватныя яўрэйскія чайныя, якія адчыняліся былымі ўладальнікамі вінных крамаў, дзе прадавалася гарбата самых горшых гатункаў і дазвалалася распіваць прынесеныя з сабой гарэлку і віно, а часам і купляць іх [1, арк. 35]. Негледзячы на відавочнае парушэнне заканадаўства, улады так і здолелі іх ліквідаваць, з прычыны асцярожнасці ўладальнікаў і наведвальнікаў.

Бібліятэкі і чытальні, якія падпарадкоўваліся камітэтам забяспечвалі мясцовых жыхароў кнігамі, якія ці выдаваліся на абанемент, ці чыталіся на месцы. Загадчыкі бібліятэк-чытален у сваіх справаздачах адзначалі колькасць наведвальнікаў і абанементаў (асобна хрысціян і яўрэяў), вызначалі найбольш папулярныя літаратурныя жанры і вялі ўлік чытачоў па ўзросту [7, арк. 18].

Асобна можна вызначыць асабістыя дадзеныя членаў камітэтаў. Статут камітэта вызначаў колькасць абавязковых членаў з ліку службовых асоб і духавенства. Астатнім стаць членам камітэта можна было пасля асабістага прашэння, але часцей, улады рассылалі запрашэнні, абапіраючыся на спісы благанадзейных асоб, якія складаліся паліцэйскімі органамі[9, арк. 2-14]. Прыналежнасць да камітэта вызначалася ці актыўнай працай, ці 5-рублёвым шгогадовым членскім узносам.

Цыркуляры галоўнага ўпраўлення па неакладных збораў і казённага продажу піцей Міністэрства фінансаў датычацца арганізацыйнай дзейнасці камітэтаў. Гэта разнастайная інфармацыя ад узору знакаў адрознення членаў камітэта да вызначэння правіл арганізацыі чайных і паводзін іх наведвальнікаў [2, арк. 27; 3, арк. 141].

Выкананне гэтых норм было абавязковым, што часцей за ўсё перашкаджала эфектыўнай дзейнасці і не спрыяла развіццю ініцыятывы на месцах.

Акрамя антыалкагольнай дзейнасці камітэт займаўся асветніцтвам і арганізацыяй дасуга насельніцтва. Так у Віцебску была арганізавана зона адпачынку на Юр'евай Горцы, дзе праводзіліся народныя гулянні, пад час якіх працавалі каруселі, выступалі фокуснікі і гімнасты, праводзіліся кінапаказы і веласіпедныя спаборніцтвы [5, арк. 3]. Зімой на Заходняй Дзвіне дзейнічаў каток з лядовымі горкамі, які павінны быў адцягнуць насельніцтва ад кулачных баёў, якія праводзіліся тут жа [5, арк. 4]. Ладзіліся народныя гулянні з прычыны дзяржаўных урачыстасцей: 100-годдзя з дня нараджэння А.С. Пушкіна (1899 г.), 50-годдзя адмены прыгоннага права (1911 г.), 100-годдзя Айчыннай вайны 1812 года, 300-годдзя дома Раманавых (1913 г.). На Каляды і Новы год камітэт арганізоўваў ёлкі для дзяцей з бедных сямей.

Частка дакументаў датычыцца гісторыі віцебскага гарадскога тэатра. Гэта перапіска паміж камітэтам, гарадскімі ўладамі і кіраўніцтвам тэатра аб арганізацыі народных спектакляў і неабходнасці ў сувязі з гэтым рамонту тэатра; пералік спектакляў і тэатральнага рэквізіта [1, арк. 28]. Народныя спекталі праводзіліся да верасня 1903 г. і былі спынены ў сувязі з адсутнасцю інтарэса з боку "простага народу", большасць наведвальнікаў складалі яўрэі [6, арк. 5].

Сярод прыватнай перапіскі адзначаюцца лісты з просьбамі аб арганізацыі чайных і прыёме на працу. Працаваць у чайной з сярэднім заробкам 180 рублёў у год, выказвалі жаданне асобы рознага сацыяльнага стану: настаўнікі на летні перыяд, члены сямей святароў, жонкі чыноўнікаў [10, арк. 5].

Даволі актуальна і сёння гучаць лісты насельніцтва да губернатараў, з просьбамі не зачыняць чайныя. Так, напрыклад, ліст ад насельніцтва горада Сураж у сувязі з рашэннем закрыць з 1 красавіка 1907 г. гарадскую чайную: "…Трезвое же и просвещённое население более способно и к угождению Богу, и к исправному отбытию государственных повинностей, что в общем вполне способно пополнить государственному казначейству быть может получаемый какой-либо сравнительный недобор" [4, арк. 28].

Такім чынам, фонды губернскіх камітэтаў папячыцельтсва аб народнай цвярозасці могуць быць карыснымі як для даследчыкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне барацьбы з алкагалізмам, так і для даследчыкаў гісторыі дзяржаўных устаноў, гандлю, прадпрымальніцтва і паўсядзённага жыцця на мяжы XIX–XX стст.

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 9.
2. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 109.
3. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 113.
4. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 146.
5. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 200.
6. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 201.
7. НГАБ. – Ф. 2555. – Воп. 1. – Спр. 241.
8. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 2.
9. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 10.
10. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 21.
11. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 85.